*Дзясятага снежня*
*Класная работа*

# ***Сказы з аднароднымі членамі (без злучнікаў і са злучнікамі). Знакі прыпынку***

*Трэба любіць, ведаць і шанаваць мову свайго народа і ўмець дасканала валодаць ёю.*

*Я.Колас*

# ЭПІГРАФ

Трэба любіць, ведаць і шанаваць мову свайго народа і ўмець дасканала валодаць ёю.

Я.Колас





# Аднародныя члены сказа

1. Адказваюць на адно і тое ж пытанне.
2. Адносяцца да аднаго слова.
3. Словы адной часціны мовы (рэдка могуць быць словы розных часцін мовы).
4. Раўнапраўныя словы (не залежаць адзін ад другога)
5. Могуць быць аднароднымі як галоўныя члены сказа, так і даданыя.
6. У сказе можа быць некалькі радоў аднародных членаў.



Знайдзіце аднародныя члены сказа, расстаўце ў сказах знакі прыпынку і зрабіце вывад, пры якіх умовах аднародныя члены сказа адасабляюцца на пісьме.

- Лёгка  хораша звонка спяваў гарманіст.
- Навучыўся я матчынай мове і задуманым песням яе.
- I хлеб і песня і шчасце прыходзяць да чалавека пасля шчырай працы.
- Хлопчык пачаў даставаць з кошыка кветкі і грыбы і ягады.
- Алесь узяў з сабою кнігу і сшытак аловак і ручку.
- Смех і дзіцячыя галасы даносіліся цяпер не з рэчкі а з бульбянога поля.
- Песня гучала ціха але выразна.
- Прачытаў хутка ды не вельмі ўважліва.



# Правер сябе

- Лёгка, хараша, звонка спяваў гарманіст.
  [О,О,О].
- Навучыўся я матчынай мове і задуманым песням яе.
  [О і О].
- І хлеб, і песня, і шчасце прыходзяць да чалавека пасля шчырай працы. [іО, іО, іО].
- Хлопчык пачаў даставаць з кошыка кветкі, і грыбы, і ягады.
  [О, іО, іО].
- Алесь узяў з сабою кнігу і сшытак, аловак і ручку.
  [ОіО, ОіО].
- Смех і дзіцячыя галасы даносіліся цяпер не з рэчкі, а з бульбянога поля. [О, а О].
- Песня гучала ціха, але выразна. [О, але О].
- Прачытаў хутка ды не вельмі ўважліва.
  [О, ды (= але) О].

Выпісаць сказы, у якіх ёсць аднародныя члены, вызначаюць іх сінтаксічную функцыю, расставіць у сказах знакі прыпынку і скласці схемы.

- За крайняй хатай вёсачкі далёка распасціраліся жоўтае поле.
- Прыдарожная канава зарасла травой з жоўтымі і белымі кветкамі.
- На прасторнай раўніне каля дарогі стаяла белая бяроза.
- Восень прыбрала дрэвы ў залаты ўбор, і бяроза была шчаслівая.
- Наступіла зіма.
- Шапаціць мне штосьці жыта, але слоў не гаворыць.
- Снег засыпаў поле, лес, жыллё, людзей.
- Мой край ясназоры, прайшоў ты нямала шырокіх і вузкіх дарог.
- Снежнае поле заблісчэла на вясновым сонцы.
- Пацяклі, загаварылі першыя ручаіны.
- Чалавек павінен падарожнічаць і ведаць тую зямлю, на якой нарадзіўся.
- Спакойнае і ціхае возера зачаравала падарожнікаў.

# Правер сябе

- За крайняй хатай вёсачкі далёка распасціраліся жоўтае поле.
- Прыдарожная канава зарасла травой з жоўтымі і белымі кветкамі. [О і О].
- На прасторнай раўніне каля дарогі стаяла белая бяроза.
- Восень прыбрала дрэвы ў залаты ўбор, і бяроза была шчаслівая.
- Наступіла зіма.
- Шапаціць мне штосьці жыта, але слоў не гаворыць. [О, але О].
- Снег засыпаў поле, лес, жыллё, людзей. [О,О,О,О].
- Мой край ясназоры, прайшоў ты нямала шырокіх і вузкіх дарог. [О і О].
- Снежнае поле заблісчэла на вясновым сонцы.
- Пацяклі, загаварылі першыя ручаіны. [О,О].
- Чалавек павінен падарожнічаць і ведаць тую зямлю, на якой нарадзіўся. [О і О].
- Спакойнае і ціхае возера зачаравала падарожнікаў. [О і О].

Запісаць тэкст. Уставіць прапушчаныя літары, раскрыць дужкі, расставіць знакі прыпынку. Падкрэсліць аднародныя члены сказа. Скласці схемы сказаў.

## Дарога

Др…жыць млее (у,ў)далечыні лё(г,х)кая смуга. Яна вабі(т,ц)ь (т,ц)ягне да сябе. Смуга ахінае далёкія вёскі (у,ў)згоркі палі. Хоч…цца хутч…й дайс(т,ц)і да іх (у,ў)бачыць (у,ў)сё, як ёс(т,ц)ь.

# Правер сябе

Запісаць тэкст. Уставіць прапушчаныя літары, раскрыць дужкі, расставіць знакі прыпынку. Падкрэсліць аднародныя члены сказа. Скласці схемы сказаў.

## Дарога

Дрыжыць, млее ўдалечыні лёгкая смуга. Яна вабіць, цягне да сябе. Смуга ахінае далёкія вёскі, узгоркі, палі. Хочацца хутчэй дайсці да іх, убачыць усё, як ёсць.

# ФІЗКУЛЬТХВІЛІНКА







# Графічны дыктант

- І на вяршалінах, і на прагалінах, і на ўзлессі ляжаў снег.

  [іО, іО, іО].
- З нашай бульбы можна прыгатаваць дранікі, бабку, клёцкі.

  [О,О,О].
- Мелодыю чулі не адзінкі, а мільёны.

  [О, а О].
- У ветраны дзень здаецца, што сонца толькі свеціць, але не грэе.

  [О, але О].



# Рэфлексія



- Што новага вы даведаліся на ўроку?
- Ці дасягнулі пастаўленых мэт?
- Над чым яшчэ трэба папрацаваць дома?





# Сінквейн

Вучні
Актыўныя, разумныя.
Вызначалі, тлумачылі, даказвалі.
Выказваю ўдзячнасць за працу.
Малайцы!



# ДАМАШНЯЕ ЗАДАННЕ

*П. 26, пр. 181*

